

# Рарытэты з гарышча

**31 кастрычніка ў Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага адкрылася выстава "Духоўная спадчына стагоддзяў". Тут выставілі старадаўнія кнігі з фонду былой бібліятэкі Ордэна Айцоў Францысканцаў у Гродне.**

На экспазіцыі больш за 150 кніг XVII-XIX ст., якія прадаставіў ксёндз-настаяцель Гродзенскага францысканскага касцёла Юзэф Макарчык. Кнігі па змесце не толькі рэлігійныя, але і навуковыя, навукова-папулярныя, выданні па філасофіі, геаметрыі, фізіцы і інш.

Цікава тое, што рарытэты былі знойдзены выпадкова. Ксёндз Юзэф знайшоў схаваныя кнігі ў касцёле. Адны на гарышчы, іншыя ў склепе. Убачыўшы каралеўскую пячатку на першай знаходцы, стала зразумела, што гэта каштоўная рэч. Паступова была знойдзена і сама бібліятэка.

Кнігі і дакументы напісаны на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. Друкаваліся яны ў ВКЛ, Рэчы Паспалітай, а таксама ў еўрапейскіх друкарнях. Вельмі захапляюць рукапісныя кнігі. Самым каштоўным рукапісным дакументам з'яўляецца зборнік прывілеяў і дакументаў XVI-XVII ст. Самыя старыя датуюцца 1561 годам. Цікавым з'яўляецца і прывілей 1647 года за подпісам караля Уладзіслава IV.

Сярод кніг ёсць адна на нямецкай мове. Па зместу — прыродазнаўчая. Датуецца яна 1743 годам. Шмат рэлігійных кніг: бібліі, службоўнікі, трэбнікі, тэалагічныя трактаты і інш.

Ксёндз Юзэф на прыканцы падарыў бібліятэцы некалькі кніг. Яму ў знак удзячнасці падарылі ікону, якую сваімі рукамі зрабіла майстар залатнога шыцця Галіна Курносава.

**Антаніна ЖВІРЫДОЎСКАЯ.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**